# Да ведама ўсіх Беларускіх настаўнікаў м. Менску.

Каляднае сьвята (ёлка) для ўсіх хрысьціянскіх дзяцей м. Менску адбудзецца 11-га студня г. г., а 3-й гадзіне ўдзень ў тых памяшканьнях, якіе адзначаны Агульным Камітэтам па арганізаваньню гэтага сьвята. Ёлка для школьнікаў будзе уладжана пераважна у школьных памяшканьнях па 2—4 школы разам, для дзяцей з вуліцы—пры Цыркулах, а так-сама ў Белай Салі, ў Работніцкім клюбе, ў Камерцыйнай школе і іншых мясцох. Усяго будзе уладжано ў Менску 45 ёлак для дзяцей—школьнікаў і з вуліцы. Усім дзецям будуць разданы на ёлках падарункі—булкі, пернікі, цукеркі і інш.

Кожная школа ідзець пад кіраўніцтвам сваіх настаўнікаў—настаўніц у тое памешканьне, аб якіх будзе даведзена да агульнага ведама праз Менскую прэсу. Пажадана, кабь настаўніцы і кі школаў прынялі учасце ў прамовах на сьвяце да дзяцей. Пажадана, каб дзеці выступалі з №№ дэклямацыі і каб праспелі сваім хорам колькі песьняў.

9-га студзеня пачынаецца падзел па мяшочках падарункаў для дзяцей. Падзел гэты будзе адбывацца ў памяшканьні Польскай Рады Школьнай (Дамініканская, 34). Пажадана, каб настаўнікі-цы школаў прынялі у гэтым падзеле учасьце.

У тэй жа Школьнай Радзе, 10-га студзеня раніцай, будзе раздача ёлак і падарункаў. Кіраўнік кожнай школы павінен пры гэтым мець з сабой сьпіс сваіх школьнікаў.

З прычыны таго, што Беларуская Школьная Рада позна даведалася аб уладжаньні „ёлак“, шмат што можа быць ня ў мысьль настаўнікаў школаў. Але таму-ж самі настаўнікі павінны пастарацца, каб школьнікі ня былі скрыўджаны і каб на гэтых сьвятах іх школа ні займала апошняга месца, як у №№ хоравых, так і ў дэклямацыі. Калі настаўніцы і настаўнікі самі прыдуць на сьвято ўсе акуратна і прывядуць усіх дзяцей сваей школы, то пераважнае значэньне на гэтым сьвяце будуць мець як раз школы беларускіе.

**Беларуская Школьная Рада**